На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб Колас

№ 100 (452)

Чацвер, 4 чэрвеня 1998 г.

Выдаецца з ліпеня 1995 г. на беларускай і рускай мовах

Перыядычнасць — 5 разоў у тыдзень

Кошт: у кіёсках і крамах — 3000 руб., у індывідуальных гандляроў — свабодны.

Народная Воля

Сонца	Усход	Захад
Віцебск	4.23	21.29
Магілёў	4.32	21.24
Гомель	4.34	21.13
Мінск	4.43	21.34
Гродна	4.56	21.47
Брэст	5.05	21.41

Першая квадра 2 чэрвеня.

Старшыня назіральнага сойму БХК Васіль Быкаў папрасіў раду камітэта вызваліць яго ад пасады на тэрмін да аднаго года

Рада Беларускага Хельсінкскага камітэта на сваім пасяджэнні разгледзела заяву старшыні назіральнага сойму БХК Васіля Быкава, у якой змяшчаецца просьба вызваліць яго ад пасады старшыні тэрмінам на адзін год. Гэта звязана з тым, што ПЕН-цэнтр Фінляндыі прапанаваў вядомаму беларускаму пісьменніку гадавы адпачынак з лячэннем у сябе ў краіне, а таксама магчымасць займацца творчасцю ў спакойнай абстаноўцы. Заяву Васіля Быкава Рада БХК прыняла да ведама.

У сувязі з заявай Веры Страмкоўскай аб выхадзе з БХК рада камітэта мае намер заявіць аб непалітычным характары сваёй дзейнасці

Рада Беларускага Хельсінкскага камітэта 1 чэрвеня на сваім чарговым пасяджэнні разгледзела заяву вядомага адваката Веры Страмкоўскай, якая ўзначальвала ў БХК адвакацкую групу, аб выхадзе з яго саставу "ў сувязі з нязгодай з дзейнасцю камітэта".

Большасць выступаючых успрынялі гэтую заяву як папрок у палітызаванасці ўсёй дзейнасці БХК. А старшыня БХК Таццяна Процька, падводзячы вынік дыскусіі, паведаміла: бліжэйшым часам будзе падрыхтавана заява аб тым, што "ніякай палітычнай дзейнасцю мы не займаемся". Пры гэтым кіраўнік камітэта нагадала аб рашэнні назіральнага сойму БХК, падпісаным яго старшынёй Васілём Быкавым, дзе быў пацверджаны непалітычны характар арганізацыі і прапанавана нават больш цеснае супрацоўніцтва "з палітычнымі сіламі ў статутных мэтах, якімі з'яўляюцца пытанні абароны правоў чалавека".

Выхад В.Страмкоўскай з саставу БХК прымусіў членаў Рады больш крытычна ацаніць сваю працу. Так, была выказана заўвага, што Рада перастала быць рабочым органам камітэта; прынята рашэнне штомесяц праводзіць яе пасяджэнні, заслухоўваць справаздачы кіраўнікоў камісій, рэгіянальных арганізацый і груп, арганізаваць пастаянна дзеючую школу грамадскіх абаронцаў.

Уладзімір ТРАЦЦЯКОЎ, БелаПАН.

Сёння ў Беларусі налічваецца ў паўтара раза больш дзяцей-сірот, чым у пасляваенным 1946 годзе

Сёння ў Беларусі налічваецца 23.618 дзяцей-сірот — у паўтара раза больш, чым у пасляваенным 1946 годзе.

Такая статыстыка прагучала на прэс-канферэнцыі, прымеркаванай да Міжнароднага дня абароны дзяцей. Удзельнікі прэс-канферэнцыі лічаць, што ў цэлым дзяржава праводзіць паслядоўную палітыку ў галіне абароны інтарэсаў і правоў дзяцей. Так, па словах намесніка старшыні Беларускага дзіцячага фонду Аляксандра Трухана, "у апошнія гады ў краіне склалася сістэма заканадаўчых актаў па абароне правоў дзіцяці, на якую абапіраецца сумесная дзейнасць дзяржаўных структур і грамадскіх арганізацый". Разам з тым у рэспубліцы існуюць праблемы мацярынства і дзяцінства. Некаторыя з іх, у тым ліку "пытанні фарміравання асобы дзіцяці і развіцця яго творчых здольнасцяў", сталі цэнтрам увагі на Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, якая прайшла нядаўна ў рэспубліканскім піянерскім лагеры "Зубраня".

Па словах начальніка галоўнага ўпраўлення сацыяльнай і выхаваўчай працы Міністэрства адукацыі Георгія Бутрыма, сёння пры агульнай стабілізацыі ўзроўню дзіцячай і падлеткавай злачыннасці ў краіне вырасла колькасць жорсткіх дзіцячых злачынстваў, у прыватнасці, забойстваў. Больш стала самагубстваў сярод дзяцей. "Гэтыя дзеці, хутчэй, не злачынцы, а ахвяры нашага ладу жыцця, сямейнага няшчасця, выдаткаў школьнага і сямейнага выхавання", — адзначыў Г.Бутрым. Дарэчы, штогод каля 1500 дзяцей звяртаюцца ў Беларускі дзіцячы фонд за дапамогай у абарону сваіх правоў і годнасці супраць дыскрымінацыі і насілля з боку равеснікаў і дарослых. "Ва ўмовах крызісу сям'і, які абвастрыўся ў краіне, дзяржава найперш імкнецца падтрымаць шматдзетныя сем'і і сем'і з дзецьмі-інвалідамі, якіх у краіне дзесяткі тысяч", — падкрэсліла галоўны інспектар аддзела гендэрных праблем сям'і Міністэрства сацыяльнай абароны рэспублікі Аляксандра Лісоўская.

Марат ГАРАВЫ.

Міністэрства юстыцыі зарэгістравала Беларускую сацыял-дэмакратычную грамаду

У Міністэрстве юстыцыі зарэгістравана новая палітычная партыя — Беларуская сацыял-дэмакратычная грамада, узначальвае якую Станіслаў Шушкевіч.

Такім чынам, цяпер у рэспубліцы існуюць дзве сацыял-дэмакратычныя партыі — Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Народная Грамада), якую ўзначальвае Мікалай Статкевіч і БСДГ Станіслава Шушкевіча. На думку прэс-сакратара БСДП (НГ) Леаніда Дзейкі, новую структуру пакуль яшчэ нельга назваць партыяй, таму што, наколькі яму вядома, больш за палову членаў БСДГ знаходзіцца ў іншых палітычных партыях і аб'яднаннях, што, напрыклад, забаронена статутам БСДП (НГ).

Юрый ПАЦЁМКІН, БелаПАН.

Голас пратэсту

Выпусціце маладога патрыёта з-за кратаў!

Грамадскасць, і не толькі беларуская, множыць высілкі дзеля вызвалення Паўла Севярынца

Расійская арганізацыя "Антыфашысцкае маладзёжнае дзеянне", ужо адведаўшы беларускай "дэмакратыі" на "Чарнобыльскім шляху-98", пасля вяртання ў Маскву прыняло спецыяльную заяву датычна Паўла Севярынца. Ёсць звесткі, што дэпутат Дзяржаўнай Думы РФ Аркадзь Янкоўскі збіраецца накіраваць у Мінск ліст с просьбай дазволіць яму сустрэцца з Севярынцам. У выніку адмовы пытанне аб арышце лідэра "Маладога Фронту" сп. Янкоўскі наважыўся ўзняць у Дзяржаўнай Думе. І гэтую заяву гатовы падтрымаць Рыгор Яўлінскі і Валерыя Навадворская.

Міжнародныя арганізацыі таксама не засталіся абыякавымі да лёсу Паўла. Свае заявы з гэтай нагоды прынялі "Міжнародная амністыя" і "Human right watch". Дарэчы, апошняя вылучыла свайго грамадскага абаронцу Малколма Хокса. Спадар Хокс прысутнічаў сёлета на працэсе Аляксея Шыдлоўскага і Вадзіма Лабковіча. Зараз гэтыя арганізацыі ўважліва назіраюць за ўсімі падзеямі, што разгортваюцца вакол справы Севярынца.

Ну і, зразумела, самую актыўную кампанію за вызваленне свайго лідэра вядуць сябры "Маладога фронту". Працягваецца збор подпісаў, ладзяцца мітынгі ды пікеты, пра развіццё падзей рэгулярна інфармуецца беларуская ды сусветная грамадскасць. Нядаўна былі выпушчаны значкі "Свабоду Севярынцу", у хуткім часе з'явяцца майкі з такім жа надпісам. Зараз кожны можа дапамагчы ў справе вызвалення, і таму "Малады Фронт" заклікае ўсе арганізацыі, рухі, згуртаванні прымаць адмысловыя заявы альбо вылучаць сваіх грамадскіх абаронцаў.

Вольга КЛАСКОЎСКАЯ.

Стоп-кадр



Беларускія рушнікі.

На тэрыторыі Польшчы ўчынена злачынства супраць групы беларускіх грамадзян

БелаПАН сталі вядомыя некаторыя падрабязнасці злачынства, учыненага ў адносінах да групы беларускіх грамадзян у польскім горадзе Згажэльцэ 26 мая.

У той дзень восем грамадзян Беларусі былі абстраляны з агнястрэльнай аўтаматычнай зброі неўстаноўленай асобай, якая знаходзілася ў аўтамабілі. У выніку два чалавекі загінулі, а двое былі цяжка паранены.

Параненыя знаходзяцца ў раённай бальніцы Згажэльцэ, загінуўшыя — жыхары Мінска і Брэста — пахаваны на радзіме. На месца злачынства выязджаў прадстаўнік Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі ў Польшчы Сяргей Рухлядзеў. Аб гэтым здарэнні паведамлена ва ўпраўленні ўнутраных спраў Брэсцкага і Мінскага гарвыканкамаў. Па адной з непацверджаных версій, злачынства ўчынена на глебе "крымінальных разборак".

Генадзь БАРБАРЫЧ.

Выканкам Беларускай федэрацыі футболу прыняў рашэнне пакінуць Яўгена Шунтава на пасадзе прэзідэнта гэтай арганізацыі

Нагадаем, што 27 мая на пашыранай нарадзе ў Адміністрацыі прэзідэнта Аляксандр Лукашэнка назваў федэрацыю і яе прэзідэнта ў ліку вінаватых за пяцімесячную затрымку з выплатай зарплаты ігракам футбольных каманд "Дынама" і "Дынама-93", якія ўваходзяць у закрытае акцыянернае таварыства "ФК "Дынама" (Мінск)". А.Лукашэнка ў жорсткай форме прапанаваў Я.Шунтаву напісаць заяву аб адстаўцы. У той жа дзень бюро выканкама БФФ задаволіла прашэнне свайго прэзідэнта аб уходзе з пасады "па стану здароўя", аднак у панядзелак, пасля дыскусіі, якая цягнулася дзве з паловай гадзіны, члены выканкама не згадзіліся з рашэннем бюро.

Асноўнымі фактарамі, якія вызначылі пункт гледжання выканкама, сталі выказаная Еўрапейскай і Міжнароднай федэрацыямі футболу (УЕФА і ФІФА) пагроза адхілення Беларусі ад міжнароднага футболу за ўмяшальніцтва дзяржавы ў справы грамадскай арганізацыі, а таксама калектыўны зварот галоўных трэнераў каманд вышэйшай лігі з заклікам пакінуць Я.Шунтава каля руля БФФ.

Выканкам даручыў свайму бюро падрыхтаваць ліст на імя А.Лукашэнкі з выкладаннем сітуацыі ў беларускім футболе.

Як паведаміў карэспандэнту БелаПАН Я.Шунтаў, ніякай інфармацыі аб рэакцыі вышэйшых службовых асоб краіны на рашэнне выканкама ён пакуль не мае. Тым часам Камітэт дзяржаўнага кантролю краіны пачаў праверку фінансава-гаспадарчай дзейнасці федэрацыі.

Дзмітрый УЛАСАЎ, БелаПАН.

Пра што гаворыць "зайчык"-хіляк?

Пра тое, што наш "зайчык" сапраўдны хіляк, асабліва яскрава адчуваеш за мяжой. У вядучых заходніх краінах пра яго нічога не ведаюць. Нават у Расіі беларускія рублі так нізка каціруюцца, што проста няёмка за такую валюту.

Так, у міжнародным аэрапорце Шарамецьева шклянка гарбаты каштуе 6 расійскіх рублёў, ці прыкладна 45 тысяч "зайцоў". Уяўляеце? За такія грошы ў многіх сталоўках Мінска можна паабедаць. І гэта красамоўна сведчыць аб тым, што беларускі рубель — практычна чыста ўнутраны казначэйскі білет. Такому хіляку проста не месца сярод "цвёрдых" валют, а яго такая "мяккасць" і такая нізкая каціроўка высвечвае слабасць усёй эканомікі. Так што "зайчык", акрамя ўсяго іншага, паказвае абсалютную неабгрунтаванасць гучных заяў аб высокіх тэмпах эканамічнага развіцця.

Яўген ТАЎГЕНЬ.

Ну і ну!

Міжнародны семінар... у падвале

Услед за Мінскам чарговы міжнародны семінар у рамках сумеснага беларуска-амерыканскага праекта, ажыццяўляемага пад патранажам Сусветнага інстытута свабоднай прэсы, прайшоў напрыканцы мая ў Віцебску. Як і ў сталіцы рэспублікі, у горадзе над Дзвіной разглядаліся пытанні павышэння эфектыўнасці дзейнасці мясцовых сродкаў масавай інфармацыі ў цяперашніх спецыфічных беларускіх умовах. Яшчэ за суткі да пачатку мерапрыемства меркавалася, што семінар удасца паспяхова правесці ў адной з лепшых гасцініц абласнога цэнтра "Віцебск", дзе павінны былі пражываць іншагароднія ўдзельнікі форуму і амерыканскія эксперты. Арганізатарамі — Беларускай асацыяцыяй журналістаў, Мінскай асацыяцыяй падтрымкі СМІ "Свабоднае слова" і Віцебскім філіялам Фонду падтрымкі дэмакратычных рэформ імя Льва Сапегі — была замоўлена канферэнц-зала, зроблена папярэдняя аплата за паслугі.

Далей падзеі пачалі разгортвацца неверагодным для нармальных краін, але такім звычным для нас чынам. Пасля візіту ў аблвыканкам віцебскага кіраўніка семінара з мэтай запрашэння да ўдзелу ў ім загадчыка аддзела па інфармаванні насельніцтва і сувязях з грамадскасцю М.Кузьміча непрыемнасці не прымусілі сябе доўга чакаць. Позна вечарам дэпутата гарсавета і аднаго з галоўных арганізатараў форума Х.Жэляпава адшукала заплаканая прадстаўніца гатэля "Віцебск" і, саромячыся, адмовіла ў зале, бо ў іншым выпадку ёй пагражалі зняццем з работы. Усё ж якое ў нас магутнае застаецца тэлефоннае права, як аператыўна і нахабна працуюць асобныя чыноўнікі "вертыкалі"! У кароткі тэрмін зрабілі максімум, каб абмежаваць кола ўдзельнікаў семінара, асабліва з дзяржаўных газет. Але сарваць мерапрыемства, застрашыць многіх людзей ім не ўдалося.

На шчасце, удалося знайсці невялічкую залу ў падвале жылога дома, дзе месціцца адна з грамадскіх арганізацый, засяліць у іншым гатэлі прыехаўшых з гарадоў і раёнаў людзей. Адна з іх нават узяла на гэтыя два дні адпачынак за свой кошт, каб прыехаць сюды. Не забаяліся, прынялі актыўны ўдзел у семінары мае калегі з асобных дзяржаўных газет, хоць іх, як і астатніх, здымалі на відэакамеру падазроныя асобы ў цывільным. А найбольш парадавала, што пераважала на тым семінары моладзь, за якой будучае краіны.

Тое, што семінар па праблемах прэсы адбыўся ў Віцебску ў падвале жылога дома, лішні раз пацвердзіла, якім чынам у нас улады забяспечваюць свабоду слова, друку, асноўныя правы журналістаў. Але гэтыя бытавыя нязручнасці не засмуцілі вядучых супрацоўнікаў і кіраўнікоў Сусветнага інстытута свабоднай прэсы К.Хэсвелла, Д.Фрайфельда, Э.Джонсана, якія шчыра давodзілі свой багаты айчынны вопыт забеспячэння свабоды для амерыканцаў і друку. Згодна з першай папраўкай да Канстытуцыі ЗША, "Кангрэс не павінен выдаваць ніводнага закона, абмяжоўваючага свабоду слова ці друку, або права народа мірна збірацца...". Менавіта на гэтым прынцыпе больш двух стагоддзяў заснавана і паспяхова існуе прэса ў гэтай краіне.

У нашай Беларусі наадварот — з кожным днём палітыка ўлады ў дачыненні да газет, радыё, тэлебачання становіцца ўсё больш жорсткай, нахабнай і рэпрэсіўнай, аб чым пераканаўча гаварылі на семінары А.Гуляеў, А.Завадскі, Ю.Тапарашаў, дэпутат Вярхоўнага Савета У.Нісцюк і многія ўдзельнікі дыскусіі. Мае шматлікія гутаркі з калегамі засведчылі, як невыносна цяжка стала працаваць і даводзіць праўдзівае слова чытачам прыстойным журналістам з дзяржаўных газет. Выклікае аптымізм, што не ўсе работнікі праўладавых СМІ (у ЗША, да прыкладу, няма ніводнай дзяржаўнай з больш чым паўтары тысячы штодзённых газет, 11 тысяч часопісаў, як і няма ніводнага дзяржаўнага з соцень працуючых радыё- і тэлестанцый) гатовы гандляваць сваім сумленнем, пераўтварацца ў прадстаўнікоў першай старажытнай прафесіі, і таму прама на семінары напісалі заявы аб прыёме ў Беларускую асацыяцыю журналістаў.

Сёння, на жаль, мы пакуль гаварылі з амерыканцамі быццам на розных мовах. Чым больш улада імкнецца ўтойваць ад народа праўду жыцця, тым менш такая палітыка мае шанцаў на перспектыву. Будучыня і ў нашай краіне — за праўдзівым, ідэалагічна незаангажаваным, вольным друкам, а значыць, і за заможным адкрытым грамадствам.

Уладзімір ШЫК.

Надвор'е

4 і 5 чэрвеня на тэрыторыі рэспублікі захаваецца пераменная воблачнасць. 4 чэрвеня — у заходніх і цэнтральных раёнах, 5 чэрвеня ўначы — па паўднёва-ўсходняй палавіне рэспублікі кароткачасовыя дажджы, месцамі навальніцы. Тэмпература паветра ўначы — +12...+17, 5 чэрвеня па паўночным захадзе — +9...+14, удзень — +19...+24, 4 чэрвеня па паўднёвым усходзе да +28.

Демократия по-белорусски

Гарри Погоняйло лишен адвокатской лицензии. И так будет с каждым юристом, посмевшим защищать патриотов Беларуси

Всем известный сказочный дракон, у которого на месте каждой отрубленной головы вырастает новая, здравствует, оказывается, до сих пор. С приходом лета выросла одна такая голова в Министерстве юстиции. В пламени разверзнутой пасти чудовища сгорела... лицензия адвоката Гарри Погоняло, защитника национального молодежного лидера Павла Северинца.

Ведь, казалось бы, какие здесь могут быть препятствия, если Беларусь унифицирует законы, имеет единую таможенную, пограничную, противовоздушную и прочие зоны, создает в России рабочие места? Но вот члену Российской гильдии адвокатов Гарри Петровичу Погоняйло не только запретили защищать белоруса Павла Северинца, а 2 июня 1998 года вообще лишили белорусской лицензии.

Еще одна голова-преграда, похоже, прорастает в Министерстве внешнеэкономических связей. Более полугода эта правительственная структура не регистрирует на Беларуси представительство Московской межтерриториальной коллегии адвокатов.

К слову сказать, препоны против единения Беларуси и России вырастают именно на белорусской стороне. В России никаких преград белорусским общественным организациям не выставляют. Может быть, потому, что смерть дракона, как и у Кощея Бессмертного, хранится в игле, которая маскируется в ветках дерева, именуемого "вертикалью"?

Валерий ЩУКИН.

Шчыра

Я заўжды буду з "Народнай воляй"!

Добры дзень, шаноўная рэдакцыя!

Хочацца пагаварыць з Вамі, як з даўнім, добрым сябрам. "Народная воля" — мая газета з першага нумару. Я ўжо два разы Вам пісала, і мае лісты былі надрукаваны. Тое, аб чым хачу зараз напісаць, закранае не адну мяне.

Усё жыццё працавала на заводзе, выйшла на пенсію. І тут дзяржава пачала дзяліць маёмасць. Атрымала я сертыфікат аж на 237.000 руб. Многія гэтыя чэкі прадалі за якую сотню. Я набыла акцыі аднаго з мінскіх ТАА. Ну, думаю, буду жыць на дывідэнды.

У гэтым месяцы, атрымаўшы пенсію, прыдбала сабе тое-сёе з вопраткі і абутку. Бачу, што не засталося і на хлеб. Але ж у мяне ёсць акцыі! Пайшла атрымоўваць грошы. За ўвесь 1997 год мне налічылі 58.000 рублёў. Вось і шыкуй. Так, чарговы здзек з працоўнага чалавека.

Але як бы ні было цяжка, я заўжды буду з любімай газетай "Народная воля". Поспехаў Вам у працы.

З павагай

Яніна ДЗЕДАВЕЦ, пенсіянерка.
Мінск.

Людмила ГУЛЯКЕВИЧ

Польский суд не выдал Александра Пупейко Беларуси

Репортаж из зала варшавского воеводского суда специального корреспондента "Народной воли" в Варшаве



1 июня в Польше это, как и везде, первый день лета и День ребенка. В этом году он был знаменателен здесь еще и тем, что именно на этот день было назначено заседание Варшавского воеводского суда по делу об экстрадиции Александра Пупейко. Со времени задержания польскими органами (на основании "гончего листа" Интерпола, выставленного Беларусью) белорусского бизнесмена в декабре прошлого года здесь не пропадает интерес ко всему, что связано с этим делом и личностью Александра Пупейко. Причем интересуют польских журналистов вовсе не пресловутые банковские счета Лукашенко и его команды, а состояние дел с правами человека и демократическими нормами в Беларуси, в том числе и такими, как независимость судов, свобода предпринимательства и выражения собственного мнения. Так что судебное слушание по делу Пупейко в очередной раз попало в сводку самых важных событий в государстве, которую ежедневно подготавливает для всех СМИ государственное Польское пресс-агентство (PAP). А суд объявил свое слушание открытым, то есть позволил присутствовать на нем всем желающим, в том числе и прессе. Заседание даже было проведено в большом зале, специально для того, чтобы могли поместиться все журналисты. Ограничение было одно: во время заседания нельзя было снимать на камеру и фотографировать (но можно было, к примеру, свободно входить и выходить из зала), что судья предложил сделать во время оглашения решения суда. Добавим, что уже дневные новостные программы польского радио и телевидения передавали решение суда по вопросу экстрадиции белорусского бизнесмена как новость номер один.

...Для самого Александра Пупейко этот день начался как обычно: он не съел завтрака, поскольку вообще не завтракает, как он сказал корреспонденту "Народной воли". Правда, его жена Юлия призналась, что ночью практически не спала — ей приснился Пацевич, а кто ж заснет, если ему ТАКОЕ снится. У дверей зала заседаний Александр с женой и своими адвокатами появились буквально за несколько секунд до начала слушания — чтобы избежать толпы журналистов, они ожидали назначенного времени за чашечкой кофе в кафе, находящемся в здании суда. Однако лавину журналистов ничто не может остановить — тут же защелкали фотоаппараты, снимали камеры, репортеры бросились к Александру Пупейко и его адвокатам с вопросами.

Интересно, что в Польше никто не объявляет: "Встать! Суд идет!". Просто, когда входят судьи, встают прокурор и адвокаты, а за ними все остальные. Как судьи, так и адвокаты и прокурор на заседании должны быть одеты в соответствующие мантии. Все это создает впечатление, что уважение и доверие к суду здесь строится не на властном приказании и обязанности вставать, а на его особом статусе. Любопытно и то, что дело Пупейко в суде называлось совсем не грозно: "Заявление о выражении мнения по предмету обращения иностранного государства".

Прежде чем суд выразил это самое мнение, председатель суда Януш Янковски представил два обвинения белорусских правоохранительных органов в отношении Александра Пупейко: одно из них сопровождало просьбу о задержании белорусского бизнесмена и говорило о том, что он разными нечестными методами выманил и не вернул банковский кредит на 1 млн. 200 тыс. долларов, а второе обвинение белорусская прокуратура представила польским коллегам в качестве материала, доказывающего вину Пупейко, — здесь уже идет речь о совершенно других фирмах и кредитах на общую сумму 4 млн. долларов. Причем у ребят из белорусских органов сумма в 4 млн. получилась от сложения 2 миллионов с 1 миллионом, так что польским судьям самим было не под силу разобраться в предложенных им головоломках. Председатель суда Янковски, впрочем, не стал брать на себя ответственность за интерпретацию столь малограмотных материалов дела и сослался на то, что когда в Варшаву приезжали в связи с делом Пупейко представители белорусской прокуратуры, то у них пробовали получить разъяснения как по математической стороне обвинения, так и по его существу, однако белорусский прокурор также был вынужден признать, что ему трудно что-нибудь разъяснить (то есть самому понять!) по данным материалам.

(Окончание на 3-й стр.)

Шаноўныя сябры!

Публікуючы абанементны бланк, мы спадзяёмся, што Вы яго запоўніце і застанецеся пастаяннымі чытачамі "Народнай волі" ў другой палове 1998 года.

Ф.СП-1

Міністэрства сувязі і інфарматыкі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету **63222** (індэкс выдання)

Народная Воля

Колькасць камплектаў

на 1998 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды ______ (паштовы індэкс) ______ (адрас)

Каму ______ (прозвішча, ініцыялы)

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету **63222** (індэкс выдання)

ПВ	месца	літар

Народная Воля

Кошт	падпіскі	______ руб.	Колькасць камплектаў
	пераадрасоўкі	______ руб.	

на 1998 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды ______ (паштовы індэкс) ______ (адрас)

Каму ______ (прозвішча, ініцыялы)

Демократия по-белорусски

“Исторический” процесс по иску о защите чести и достоинства Игоря Кузнецова к “Народной газете” и Адаму Залесскому

24 мая 1996 года “Народная газета” (не путайте с “Народной волей”) напечатала статью доктора исторических наук профессора Адама Залесского “Как хочу, так и ворочу” с подзаголовком “Антиисторические импровизации историка Игоря Кузнецова”. Кандидат исторических наук доцент Игорь Кузнецов счел, что публикация задевает его честь и достоинство, порочит деловую репутацию, и представил редакции опровержение под названием “Такое невинное слово ”репрессия”. Газета не напечатала возражение, оно было опубликовано в ином издании.

27 февраля 1998 года Игорь Кузнецов подал иск к газете и автору о защите чести и достоинства в суд Советского района города Минска. 3 апреля судья Марина Федорова попыталась начать рассмотрение заявления истца, но не явились ответчики. 13 мая состоялось первое слушание дела.

В чем состоит особенное, действительно историческое и уникальное значение данного гражданского дела? В нем буквально все шировот-навыворот, а это, согласитесь, любопытный судебный прецедент.

В нелепом и парадоксальном положении очутилась “Народная газета”. Так уж сложилось исторически, что в свое время Игорь Кузнецов систематически пользовался ее страницами для изложения своих научных взглядов на проблему сталинских репрессий. За последние четыре года исследователь острой темы напечатал именно в этой газете более десятка статей, в том числе, к примеру, “В ГУЛАГе был остров людоедов” (17 августа 1994 года) или “...С конфискацией судьбы” (27 февраля 1996 года). Однако примерно к середине 1996 года краткий исторический период “разномыслия” для бывшей парламентской “Народной газеты” завершился.

Тему сталинских репрессий на ее страницах продолжил доктор исторических наук Адам Залессий. И он же в ходе судебного заседания 13—14 мая 1998 года заявил, в частности, что его оппонент тиражировал свою точку зрения в оппозиционных национал-экстремистских газетах. Таким-то образом и угодила в “националистки” “Народная газета”, часто печатавшая публицистические статьи доцента Игоря Кузнецова. Но когда “власть переменилась”, то с отменным радикализмом издание “отшило” своего прежде любимого молодого публициста 42 лет от роду, перенеся свою любовь на 85-летнего автора, востребованного из дореволюционных еще, можно сказать, времен.

До “ренессанса” наиболее одиозных образчиков минувшего в белорусской журналистике действовала неписаная этическая норма: если тебе — газете или автору — предъявили иск о защите чести и достоинства, то безнравственно и непристойно преследовать человека за это. А именно всестороннему избиению Игоря Кузнецова как человека, гражданина и ученого и предалась “Народная газета”, разразившись статьей “Обидел ли уважаемый профессор столь же уважаемого доцента?”. Кто же помогал изданию ответить на вопрос? Понятное дело: “...редакция обратилась к другой ”страдающей" стороне профессору А.Залесскому”.

Хотелось бы и просто по-человечески напомнить ответчикам: мужики, дескать, ведь вы прекрасно знаете, что ваш оппонент не может ответить вам со страниц государственных газет, потому что они, как и “народная”, волей верхов закрыты для Игоря Кузнецова! Но взывать к порядочности и совести бесполезно — в высшей степени бесполезно. Как некогда при Сталине, издание и его внештатный автор устроили судилище над истцом на полосе “Народной газеты”.

“Разгромная” публикация о личности “уважаемого доцента” вышла 12 мая — в аккурат к началу судебного заседания. Мировая юридическая практика не расценивает подобные факты иначе как давление на суд. Ведь в разрешении спора прямо, в том числе и материально, заинтересованы оба “погромщика”: в виде компенсации понесенного морального ущерба истец по основному иску потребовал взыскать с “Народной газеты” более 320 миллионов рублей, с Адама Залесского — 850 тысяч рублей.

О газете — пока достаточно, она, надо полагать, в ходе дальнейшего судебного разбирательства еще покажет свою оппозиционность этике, морали и закону. Пока что на ее счету три очка в пользу произвола: опровержение не напечатала, на суд не являлась, оказывала давление на судью.

Об истце Игоре Кузнецове в “историческом” ракурсе данного процесса сказать практически нечего, поскольку он проявляет законопослушание, процедуры соблюдает и в судебном заседании говорит по существу дела. Он всего лишь пытается защититься как человек, ученый и публицист. Вопрос о чести весьма неодномерен, и поэтому кандидат наук к материалам дела присовокупил перечень своих работ, доказывающих его статус ученого. У него более 300 публикаций в самых различных периодических изданиях Республики Беларусь. Он автор монографий “Репрессии 30—40-х годов в Томском крае”, “Знать и помнить”, “Без грифа ”секретно”, “Конвейер смерти”. Он издал три книги: “Возвращение памяти”, “Тайны истории”, “Страницы минувшего”.

Так если об одном ученом другой ученый публично заявляет “Как хочу, так и ворочу” и “Антиисторические импровизации историка Игоря Кузнецова”, — это вредит деловой репутации объекта критики или нет? На это ответить имеет право только суд. Профессор Адам Залесский в оспариваемой публикации написал много чего достойного рассмотрения в судебном заседании.

Вот неполный перечень напечатанных в “Народной газете” высказываний в адрес Игоря Кузнецова: “вольное с ними (фактами) обращение”; “стремление к сенсационности”; “его совершенно недопустимые вольности в исторической науке”; “сделал четыре пропуска текста, не отметив их многоточиями, шесть раз внес в текст свои правки, а также продолжил искажение текста этого документа в своих комментариях”; “импровизатор”; “начал вкривь и вкось комментировать этот документ”; “плод самой беспардонной фальсификации”; “эта очередная фальсификация”, “после продолжительного суесловия он делает общий вывод”; “настаивая на своем измышлении”, “доходит до кощунственного утверждения”; “это очередное измышление”; “следуя моде фальсификаторов истории”; “продолжает подменять научный анализ голословными заявлениями”.

Выбранный из текста статьи А.Залесского ряд цитат абстрагирован от содержания научной дискуссии истца и ответчика. Высказывания целиком относятся к предмету судебного разбирательства о том, нанесен ли урон деловой репутации Игоря Кузнецова. В изображении “Народной газеты” он выглядит как законченный антипод ученого — такое однозначно негативное мнение о нем создает публикация. Последнее слово конечно же за судом, но для обыденного восприятия картина предельно ясная: да, Кузнецова охаяли, унизили, обидели.

Анализируя материалы гражданского дела, невозможно не заметить, что в Советском суде города Минска сошлись “у барьера” два совершенно разных ученых — в смысле позиции, мировоззрения, подхода к историческим явлениям. Если упростить конфликт для полной ясности, то позволительно сказать: схлестнулись сталинист (Залесский) с антисталинистом (Кузнецов). Возможно, упрощение грубоватое, но зато оно наиболее доходчиво обнажает самый корень конфликта и в журналистском расследовании допустимо — это же не судебный протокол.

При чем сталинист и антисталинист к гражданскому спору о чести? В том-то и дело, что совершенно ни при чем! Процесс потому и получается по-салтыковски “историческим”, что кандидат наук как истец пришел в суд за защитой достоинства, а доктор наук и газета, будучи ответчиками, предъявили ему политические обвинения.

Игорь Кузнецов (со священным ужасом заявил Залесский) — противник Октябрьской революции. Антикоммунист. Он (припечатала его “Народная газета”) отличается “особой антисоветской агрессивностью”. И даже ходил на конференцию, “на которой тон задавали противники курса Президента РБ”. И свои подходы он (поведали суду свидетели ответчиков) излагает как преподаватель студентам Белорусского государственного экономического университета, где работает доцентом кафедры правоведения.

Соответственно перечню “политических преступлений” против советского и президентского режимов, инкриминируемых Игорю Кузнецову, по мнению Адама Залесского и его единомышленников из Белорусского республиканского объединения “Исторические знания”, председателем коего является адепт ГУЛАГов, историка демократической формации следует лишить ученой степени кандидата наук, выгнать из университета и всячески заклеймить. Таково мировоззрение истовых служителей всех диктаторских режимов... Только что не расстрелять доцента без суда и следствия! Или и за этим скоро дело не станет?..

Ну а что же Советский суд?

На второй день процесса судья Марина Федорова вынесла определение: “Назначить по делу историко-литературоведческую экспертизу...”; “Проведение экспертизы поручить Академии наук Республики Беларусь”; “Производство по делу приостановить”.

Это пока все, что предпринял суд. Марина Федорова предпочла перепоручить решение академикам. При внимательном изучении определения суда между его строк легко читается надежда судьи перевести процесс в плоскость научной полемики по проблеме сталинских репрессий. Такие споры, как известно, в компетенцию Фемиды не входят, у нее есть шанс процессуально безупречно “отфутболить” иск о защите чести.

В сюжете не будет лишним еще один достоверный исторический факт. О личности Игоря Кузнецова с подачи его оппонентов известно уже немало. А сам Адам Залесский что за личность? А он еще во времена советской власти был известен как личность “историческая” — постоянно встревал в истории и конфликты. Он претендовал на роль “ходячей истины в последней инстанции”, завидя которую вздрагивали не только журналисты тогдашнего Дома печати, но и неуязвимые номенклатурщики идеологического отдела Центрального Комитета КПБ. Поистине суперсталинская сверхбдительность ископаемого профессора порождала неиссякаемый поток жалоб на все проявления инакомыслия, которые он подмечал в окружающей его действительности.

В бывшем архиве ЦК КПСС хранилась аналитическая записка одного известнейшего белорусского историка с подробными возражениями на “письмо” А.Залесского, адресованное последним из Минска туда, в самые верхи, в Москву, в ЦК. Послание Залесского на 150 машинописных страницах называлось “О некоторых факторах, ведущих к формированию неправильных взглядов и морально-политическому разложению наиболее неустойчивых представителей интеллигенции Белоруссии”. Самое, наверное, мягкое обвинение его автор предъявил поэту Звонаку, который, по мнению твердокаменного сталинца, написал неправильный стих и дал стиху неправильное название. Вообще же пух и перья летели от именитых писателей, искусствоведов, идеологов со страниц фундаментального доноса! Более 100 “диссидентов”, “аморальщиков”, “врагов народа” (в том числе Василя Быкова и Алеся Адамовича) “разоблачил” Залесский в том грандиозном “историческом труде”.

Вы ощутили тяжкий удушливый запах склепа? Чувства не обманывают вас. И не оставляет предощущение, что о реанимации отношений с реликтовым профессором пожалеют и “Народная газета”, и его защитники в суде, и судьи, и эксперты-академики... Те, кто вновь вызывают на свет божий исчадие сталинизма, забыли или не знают, что оно привыкло “пить кровушку” со “своих” с таким же смаком, как из “врагов народа”.

Людмила МАСЛЮКОВА, политический обозреватель “Народной воли”.

Спорт

“Золата” беларускіх гімнастак

Шмат каштоўных узнагарод сабралі беларускія спартсменкі на праведзеным у Партугаліі чэмпіянаце па мастацкай гімнастыцы. Ужо з самага пачатку спаборніцтваў, калі аспрэчваліся камандныя медалі, беларускі не ўтойвалі сваіх сур'ёзных намераў на заваяванне самага высокага месца. Маючы пасля першага дня невялікі адрыў, беларускія грацыі змаглі ў выніку не толькі пераўзысці сапернiц у майстэрстве, але і зачараваць строгіх суддзяў, якія аддалі свае сімпатыі і “золата” нашым дзяўчатам. Вось імёны чэмпіёнак: Яўгенія Паўліна, Валерыя Ваткіна і Юлія Раскіна.

Другое месца ў камандный барацьбе занялі ўкраінкі, трэцяе — расіянкі.

І яшчэ раз на п'едэстале гонару ўбачылі балельшчыкі прадстаўніцу нашай рэспублікі. Ёю аказалася Яўгенія Паўліна, якая заваявала “серабро” ў абсалютным першынстве, крыху ўступіўшы Аміне Кабаевай з Расіі. Яна ж у апошні дзень спаборніцтваў першынствавала ў практыкаванні са стужкай. А ў практыкаванні з булавамі бронзавую ўзнагароду заваявала Юлія Раскіна.

Іван Іванкоў — лепшы на перакладзіне

Абсалютны чэмпіён свету па спартыўнай гімнастыцы Іван Іванкоў быў лепшым у практыкаваннях на перакладзіне, выступаючы ў фінале Кубка свету ў Японіі. За сваю кампазіцыю ён набраў 9,675 бала. Другое месца заняў Золтан Журала з Венгрыі, трэцяе — Сяргей Федарчэнка з Казахстана. “Серабро” атрымаў наш зямляк за выступленні на кольцах. А вось наравістага каня “ўтаймаваць” не змог. Тут славуты спартсмен быў чацвёртым. Нагадаем, што гімнаст з-за перанесенай траўмы пакуль што не ўключае ў сваю праграму апорны скачок і вольныя практыкаванні.

Вячаслаў ДУТАЎ, БелТА.

Открытое письмо министру

Можно ли нищенское пособие назвать зарплатой?

Министру жилищно-коммунального хозяйства Республики Беларусь
Батуре Борису Васильевичу
от рабочих Лоевского объединения котельных и тепловых сетей

Уважаемый господин министр!

Доведенные до отчаяния, мы решили обратиться к Вам с единственным вопросом: как нам жить дальше, получая это нищенское пособие, если его можно назвать зарплатой, которой только и хватает на хлеб и квартирные услуги?

О каком здоровье наших детей может идти речь, если они живут впроголодь. Заслужили ли наши дети такой жизни?

Как жить дальше, господин министр?

А.И.КОВАЛЬЧУК, С.А.ГУЛЕВ, А.И.СИНИЛО, С.М.ГОРЛЕНКО, В.В.МОРОЗОВ, Г.Н.САМУТИН, Ю.А.КУЗНЕЦОВ, А.И.ПИСКУН, А.Г.БРЕГИД, Н.Л.ПАРФАМОВИЧ, В.В.МАКСИМЕНКО, Г.Е.ГУРИНОВИЧ *и другие.*

Письмо это из городского поселка Лоев, подписанное коммунальниками райцентра, доставлено в Минск нарочным. Его роль вызвался исполнять работник одной из котельных Анатолий Ковальчук. И одолевала им надежда: встретиться с самим министром Борисом Васильевичем Батурой, поговорить о бедах котельщиков, в том числе изношенном оборудовании, мизерной зарплате, текучести кадров... Но в приемной, словно церберы, опрятно одетого по случаю визита в столицу кочегара не допустили к министру: по личным, мол, вопросам он принимает по понедельникам. А разве это вопрос личный, когда подписывается коллектив?

Вручив редакции “Народной воли” копию письма, Анатолий Иванович снова направился в Министерство жилищно-коммунального хозяйства “нести вахту”, чтобы перехватить самого министра. Не могут же министры обходиться без обедов, ужинов... Они — тоже люди. И когда-нибудь покидают стены кабинета, особенно для совещаний. “Пусть бы президент, что ли, вызвал его в этот день к себе, — помечтал Анатолий Иванович Ковальчук. — Глядишь, и я перехватил бы его где-нибудь в коридоре для нужного разговора. А может, и пообедал бы за его счет. Наверное, у министра оклад не в миллион триста тысяч, как у меня. За обеденным столом и тему обсудили бы, волнующую рабочих-коммунальников...”

Уверен Анатолий Иванович, что общий язык с министром обязательно нашел бы. “Он у нас понимающий, — заключил Ковальчук. И сразу посетовал: — Жаль, что в приемной бюрократы”. И, распрощавшись, пошел дожидаться-караулить министра.

Хотя и взял Анатолий Иванович на день отпуск за свой счет, но хочет остаться честным перед коллективом до конца, что с письмом министр Б.В.Батуро обязательно ознакомиться. А если вдруг не выпадет у него встреча, то попросил “Народную волю”, постоянным подписчиком которой является, напечатать коллективное письмо-обращение.

Виктор СВИРКО.

P.S. *Редакция “Народной воли” традиционно внимательно относится к просьбам своих подписчиков. Надеемся, что и министрам присущ деловой стиль, если к ним обращаются рабочие из родного ведомства. Это коллективное письмо мы и адресуем Борису Васильевичу Батуре для ознакомления и разрешения сложных вопросов. Надеемся, что и Борис Васильевич не посчитает зазорным и излишним проинформировать наших читателей о том, как решается поднятая рабочими Лоевского объединения котельных и тепловых сетей архисложная проблема повышения заработной платы.*

Тэлефон набыць — гэта не жартачкі...

Зусім нядаўна ў мяне з'явілася магчымасць змяніць месца жыхарства. Пераехаў з двухпакаёвай мінскай кватэры ў прыватны дом у пасёлак Ратамка, каб трошкі палепшыць умовы жыцця сваёй сям'і.

У Мінску амаль 10 гадоў таму, не пашкадаваўшы свайго месячнага заробку настаўніка і на ўмовах вельмі прывабных для мяне і, магчыма, добрых для дзяржавы, займеў тэлефон з нумарам 43-27-82. Цяпер пераехаў. І тут пачалося!

Пасля доўгіх паходаў у раённыя вузлы сувязі Мінскага і Завадскога раёнаў горада Мінска я зразумеў, чаму мы такія далёкія ў справах тэлефанізацыі ад вядучых дзяржаў свету. Там ідзе барацьба за кліента, а ў нас ідзе барацьба чыноўніка з кліентам. Справа ў тым, што амаль усё ў нас належыць дзяржаве, а яе служачыя ну аніяк не зацікаўлены (але вымушаны рабіць выгляд), каб справы ішлі хутчэй, каб змяніць старыя тэхналогіі, каб будаваць новыя станцыі і г.д. Напэўна, калі яны будуць праяўляць гэтую зацікаўленасць, то знікне магчымасць мець хабар. Можа, таму і з'явіліся так званыя правілы карыстання дзяржаўнай тэлефоннай сувяззю, дзе столькі бязглуздзіцы, столькі магчымасцей для хабарніцтва. Прыклады? Калі ласка.

Па гэтых правілах я не маю аніякіх правоў мець тэлефон на новым месцы жыхарства. Гаспадар сям'і, якая жыла тут, прастаяў у чарзе ажно з 1982 года. Яго чарга на мяне не пяройдзе. Я павінен стаць апошнім у новую чаргу і прастаяць у ёй 16 гадоў, хоць і здаў тэлефон на старым месцы жыхарства. Вядома ж, я буду шукаць “непадкупнага” чыноўніка, які пасадзейнічае мне. Сорамна, але прыйдзецца несці хабар, бо без тэлефона цяжка — у мяне хварэе жонка.

Самы “забойны” параграф гэтых правіл — “тэхнічныя магчымасці”. Ніколі не паверу, што з 1982 года не было тэхнічных магчымасцей правесці тэлефон, бо ўсе мае суседзі ў пасёлку яго маюць і пасмейваюцца з майго пытання: “Як гэта робіцца?”.

Тое, што чыноўнікі бессаромна паводзяць сябе, я бачыў яшчэ ў Мінску, у Завадскім раённым вузле сувязі. Мой мінскі тэлефон перададзены чалавеку, які ні аднаго дня не стаяў у чарзе і не мае аніякіх ільгот на бесчарговае падпісанне ўмоў на карыстанне тэлефонам. Дарэчы, па тых жа правілах, я не страціў права мець тэлефон. Але гэта нікога не цікавіць.

Ці ж ёсць якое-небудзь выйсце? Мне здаецца, што яго не будзе да тых часін, пакуль усе сродкі сувязі не будуць прыватнай маёмасцю, пакуль не будзе зацікаўленага гаспадара.

Я ведаю, што калі будзе надрукаваны мой ліст, то не вельмі хутка я буду мець у сваім доме тэлефон — помсціць чыноўнікі ўмеюць. Але нічога — дапамогуць суседзі...

Мікола ЗАЛЕСКІ.
п.Ратамка Мінскага р-на.

Служба “01” інфармуе

За апошні веснавы тыдзень у рэспубліцы зарэгістравана 227 пажараў, у выніку якіх загінулі 6 чалавек.

Паводле інфармацыі, атрыманай БелТА ў Галоўным упраўленні ваенізаванай пажарнай службы, агнём знішчана і пашкоджана 115 будынкаў, 20 адзінак тэхнікі, 23 тоны грубых кармоў.

Агульны матэрыяльны ўрон склаў 1 мільярд 903 мільёны рублёў.

БелТА.

Стоп-кадр

Около полутонны молока в день в совхозе “Копаткевичи” Петриковского района собирают только за счет частных подворий благодаря хорошо организованной и стимулирующей сдатчиков системе.

На снимке: *по два рейса молоковоза делают в день сборщик молока Иван Нестерчук и водитель Владимир Кот.*

Фото Сергея ХОЛОДИЛИНА, БелТА.

Творчасць чытачоў

Чаму?

Што адбылося?
Не знайсці адказу...
Мы анямелі
І маўчым,
Маўчым.
Што з намі будзе?
Не ўявіць адразу,
Бо што ж мы
Пакідаем у былым?
Мы пакідаем
Попел і атруту,
І ланцугі,
І думак горкі пыл,
І як нам з гэтых
Выпутацца путаў,
Не ўцяміць,
Вось таму мы
І маўчым.
Маўчым,
Няма ў нас сіл,
Бо мы знікаем,
Зацягвае нас,
Нібы у дрыгву,
Мы гэта бачым,
Гэта адчуваем,
Толькі сказаць
Не маем сіл,
Але ж чаму?
Чаму такім
Народжаны народам,
Што моўчкі
Здзек і гвалт
Трываць прывык
І не шукае выйсця,
Нейкіх ходаў,
Каб невыносны
Гэты ўціск
Нарэшце знік?
Чаму так цяжка
Разгарнуць нам плечы
І ўзняць сваю
Высока галаву,
Каб выбрацца
З духоўнае галечы
І глянуць смела
Ў будучынь сваю?

Д.НЯГРОМНАЯ.
Мінск.

Задумаемся...

У рублях — рост. А ў тонах і штуках?

Калі верыць афіцыйнай прапагандзе, дык у нас эканоміка развіваецца даволі высокімі тэмпамі. Праўда, усё гэта падаецца ў рублях і нейкіх “супаставімых цэнах”. А як у кілаграмах і тонах? Калі паглядзіш з такога пункту погляду, дык малюнак далёка не ружовы. Вось як выглядае вытворчасць прамысловай прадукцыі ў натуральным выражэнні. Так, у красавіку сёлетняга года ў параўнанні з сакавіком электраэнергіі выпрацавана толькі 83,3%, у тым ліку цеплавой — 66,2%, дабыта нафты — 97,2%, пярвічная перапрацоўка нафты складае 93,2%, пракат чорных металаў — 97,4%, стальных труб маем — 90,2%, азотных угнаенняў выпрацавана — 87,6%, фосфарных — 90,5%, хімічных валокнаў — 92%, гумавага абутку выраблена 83,6%, металарэжучых станкоў — 64,4%, кавальска-прэсавых машын — 71,4%, грузавых аўтамабіляў — 88,1%, аўтамабільных прычэпаў — 77,4%, асвятляльных электралямпаў — 48,1%, піламатэрыялаў — 87%, паперы — 94,5%, зборнага жалезабетону — 87,9%, тканін — 93,9%. Трыкатажных вырабаў — 94,9%, вырабаў швейнай вытворчасці — 90,7%, льновалакна — 73,5%, скуранога абутку — 87%, халадзільнікаў — 90,6%, сціральных машын — 85,7%, тэлевізараў — 88,8%, матацыклаў — 76%, посуду — 97,2%, мэблі — 89,6%, гадзіннікаў — 94,9%, школьных сшыткаў — 87,9%, мяса — 96,9%, мукі — 84,9%, крупы — 79,3, цукру — 45,5%, макарон — 76,4% і г.д. і г.д.

Такім чынам, у красавіку ў параўнанні з сакавіком адбыўся рэзкі спад выпуску важнейшых тавараў і прадуктаў у натуральным выражэнні.

Яўген ТАЎГЕНЬ.

З даўгавой ямы вёску не выцягнуць ніякімі льготамі

Дзесяткі прадпрыемстваў аграпрамысловага комплексу Беларусі пазбавіліся права на атрыманне адтэрміноўкі па пагашэнні запазычанасці за энергарэсурсы. Згодна з рашэннем Савета міністраў адтэрміноўка да 1 снежня 1999 года магла быць прадастаўлена калгасам і саўгасам пры ўмове, што яны забяспечаць своечасовыя разлікі за спажываныя прыродны газ і электраэнергію ў маі гэтага года. Аднак нават пры гэтым ільготным рэжыме разлікаў у галіне па-ранейшаму назіраецца тэндэнцыя да росту пратэрмінаванай запазычанасці. Сёння агульны энергетычны доўг прадпрыемстваў і арганізацый Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання перавышае 3,6 трыльёна рублёў.

Уладзіслаў ПЛАТУН, БелТА.

Презентация

Firmenpool Belarus. Что это такое?

В Минске создана ассоциация фирм — Firmenpool Belarus. Ее “родителями” стали промышленно-торговая палата Бонна и “Общество развития внешних экономический связей и менеджмента ПТП” из Берлина. Чем вызвано рождение этого учреждения и каковы его цели? Об этом рассказывает **руководитель проекта Георгий Кондратов.**

— Его цель, — пояснил Георгий Дмитриевич, — оказание немецким фирмам необходимой помощи при их выходе на белорусский рынок. С этой целью в Минске открыто бюро. Координацию проекта осуществляет промышленно-торговая палата Бонна, финансирует земля Северный Рейн-Вестфалия.

Основные задачи проекта таковы: оказание участникам ассоциации квалифицированной помощи при выходе на рынок Республики Беларусь; налаживание контактов с белорусскими партнерами в области экспорта, импорта, кооперации, финансирования, а также с министерствами, административными органами, палатами и союзами; подготовка и проведение деловых визитов, организация участия в выставках как в минском регионе, так и по договоренности на всей территории Республики Беларусь; маркетинговые исследования.

Участниками “Firmenpool Belarus” в основном являются предприятия мелкого и среднего бизнеса следующих отраслей: машиностроение/металлообработ ка, производство товаров широкого потребления, мебельная промышленность, химическая промышленность. Им будет предоставляться информация о конъюнктуре рынка и предприятиях Республики Беларусь, ярмарках и выставках, административных органах и союзах, адреса фирм, статистические данные.

Дополнительную информацию можно получить по адресу: **220116, РБ, Минск, пр-т Газеты “Правда”, 11, офис 200-201, проект “Firmenpool Belarus” или по телефону: 272-33-98, факс 272-33-97.**

Праблема!

З занядбанага поля толькі кудзелі касмык,

альбо Чаму памеркла слава айчыннага даўгунцу

Такой крытычнай сітуацыі, якая склалася летась з вырошчваннем ільну ў Беларусі, не памятаюць нават старажылы. Цяжка ў гэта паверыць, але льноводчая галіна прынесла вяскоўцам 22 мільярды рублёў страт. З 54 льнозаводаў краіны 27, у тым ліку 11 у Віцебскай вобласці, апынуліся на мяжы банкруцтва, бо нарыхтавалі сыравіны для перапрацоўкі ў два разы меней, чым у не вельмі ўдалым 1996 годзе. А да ўзроўню 1990—1992 гадоў аб'ём нарыхтовак льнотрасты склаў толькі 24 працэнты.

Між іншым вырошчванне гэтай каштоўнай культуры заўсёды прыносіла селяніну нядрэнны прыбытак. Лён да нядаўняга часу з'яўляўся адной з самых рэнтабельных культур у сельскай гаспадарцы. Пасевы пад ім яшчэ гадоў 7—8 назад складалі толькі на Віцебшчыне больш за 90 тысяч гектараў. У 1997 годзе даўгунцом занялі 29 тысяч гектараў, пры гэтым на чатырох тысяч з-за кліматычных фактараў лён загінуў.

Да таго ж і ўраджаямі ў рэгіёне, дзе найлепшыя кліматычныя ўмовы для вырошчвання даўгунцу, апошнім часам не могуць пахваліцца. У 1996 годзе льновалакна атрымалі ў сярэднім па 5,1 цэнтнера з гектара, летась вынікі яшчэ горшыя — толькі 2,4 цэнтнера. Калгас “Расія” Шумілінскага раёна “вызначыўся” тым, што здолеў узяць толькі 75 кілаграмаў валакна з гектара. Для параўнання: у лепшыя гады асобныя гаспадаркі Талачынскага раёна атрымлівалі з кожнага гектара па тоне і больш валакна высокіх нумароў. Лепшыя калгасы былі ўдзельнікамі ВДНГ, многія працаўнікі атрымлівалі высокія дзяржаўныя ўзнагароды і нават зоркі герояў працы. Але ўсё гэта засталося ў мінулым.

На ўраджайнасць і якасць льнопрадукцыі ўздзейнічаюць многія фактары. Лён патрабуе “паклон”, шмат ручной працы, асабліва пры яго ўборцы. У вялікай ступені ягоны лёс залежыць і ад умоў надвор'я. Сёлетняя дажджлівая вясна ўскладнілася замаразкамі, затым — працяглай засухай, што не магло не адбіцца на стане пасеваў. Позна пасеялі лён, не ў лепшыя тэрміны выцерабілі. Падчас уборкі зноў зарадзілі зацяжныя асеннія дажджы, трасту, паднятую ў конусы, валілі моцныя вятры. Урэшце раннія замаразкі і нават снег згубілі гэту культуру, хоць на яе выратаванне прыйшлося мабілізаваць з гарадоў дзесяткі тысяч людзей. Але неспрыяльныя прыродныя фактары, як і недахоп льноўборачнай тэхнікі — гэта не галоўныя прычыны ўзнікшых цяжкасцей.

Непрадуманая цэнавая палітыка, лічыць генеральны дырэктар абласнога льноаб'яднання І.Д.Алтыца, прывяла да таго, што калгасам і саўгасам стала проста нявыгадна вырошчваць такую працаёмкую культуру. З гэтым нельга не пагадзіцца. За лён, дарэчы, і разлічваліся з вялікім спазненнем. Нават па году асобным гаспадаркам прыходзілася чакаць свае зробленыя грошы, што пры высокай інфляцыі рабіла гэты занятак бесперспектыўным. Ды і зараз льнозаводы плацяць гаспадаркам за тону льнотрасты ў сярэднім менш трох мільёнаў рублёў, што ў параўнанні з іншымі культурамі даволі мала.

Для любога калгаса ці саўгаса значна прасцей вырошчваць тое ж збожжа, за тону якога плацяць 4,2 мільёны рублёў, або бульбу коштам ад 4 мільёнаў рублёў за тону клубняў. Да таго ж затраты сіл і сродкаў на вырошчванне бульбы ў 10—15 разоў меншыя, чым на вырошчванне даўгунцу. У вёсцы з кожным годам рабочых рук становіцца ўсё меней і меней, таму своечасова ўбраць даўгунец з палёў няпроста. Пры дэфіцыце і дарагавізне апаратаў для хімічнай праполкі таксама праблематычна атрымаць чыстую, якасную трасту. І калі б не абавязковы план нарыхтовак, многія гаспадаркі наогул адмовіліся б вырошчваць лён.

На тэрыторыі вобласці знаходзіцца буйнейшы ў Еўропе Аршанскі льнокамбінат. Здавалася б, мець побач такога партнёра — выгадная справа. Але ў камбіната свае інтарэсы, і ён дыктуе льнозаводам нізкія закупачныя цэны на валакно. Невыпадкова палова льнозаводаў вобласці сталі стратнымі. Яшчэ два гады назад не знайшла падтрымкі ў шматлікіх пастаўшчыкоў прапанаваная дырэкцыяй льнокамбіната закупачная цана ў 800 долараў за тону валакна. За камбінатам працяглы час віселі шматмільярдныя даўгі за адгружаную раней прадукцыю, перапрацаваную ў вялізныя запасы нерэалізаваных тканін.

Праўда, зараз сітуацыя з аплатай стала паляпшацца. Аршанцы, каб не прастойваць, пайшлі насустрач сваім партнёрам. Акрамя павышэння цэн да 970 долараў за тону, прадпрыемства праводзіць залікі па даўгах заводаў за энергарэсурсы, закупляе ўгнаенні пад пасевы лёну для суседніх абласцей, адпускае партнёрам льняныя тканіны па нізкіх цэнах. Але ўсё роўна сыравіны не хапае і вытворчыя магутнасці гіганта застаюцца не загружанымі. Пры мінімальнай патрэбнасці льнокамбіната ў 25—30 тысяч тон валакна ў год заводы вобласці змогуць у лепшым выпадку даць 15—20 тысяч тон з ураджаю 1997 года.

Між іншым прадпрыемствы, якія ўваходзяць у Віцебскае льноаб'яднанне, самі апынуліся ў няпростай сітуацыі, бо па стану на 1 верасня 1997 года іх агульная крэдыторская запазычанасць складала 100 мільярдаў рублёў і перавысіла дэбіторскую на 40 мільярдаў. Траста апошняга ўраджаю мае невысокую якасць і павышаную вільготнасць. Каб давесці яе да ладу, спатрэбіцца значна больш дарагога цяпер паліва. Адным прадпрыемствам галіны ўжо зацікавіўся дзяржкантроль, бо прыняты па прымусу лён пачаў гніць. На такіх льнозаводах, як Багушэўскі, Гарадоцкі, Коханаўскі, Лёзненскі, Шумілінскі, Полацкі хутка не будзе чым займацца, бо мала назапашана сыравіны — ад 400 да 800 тон. Бычыхінскі льнозавод Гарадоцкага раёна меў трасты толькі 35 тон і даўно ўжо не працуе.

На гэтым фоне быццам нядрэнна выглядае Пастаўскі льнозавод, які закупіў сыравіны больш за ўсіх у вобласці — 2834 тоны. Адзін з нямногіх ён упэўнена стаяў на нагах, бо ўмела карыстаўся прадастаўленай магчымасцю свабодна рэалізоўваць трэцюю частку выпускаемай прадукцыі. Завод меў выгадныя сувязі з літоўскімі, расійскімі партнёрамі, выконваў буйныя кантракты для Заходняй Еўропы. Дагледжаны беларускі лён мяккі, эластычны, пры належнай якасці апрацоўкі еўрапейцы гатовы заплаціць за яго добрыя грошы ў валюце. Штогод да канца лістапада прадпрыемства разлічвалася з вытворцамі трасты.

Напярэдадні Пастаўскі завод выплаціў льносеючым гаспадаркам у выглядзе авансу 2,5 мільярда рублёў. Большая частка ўкладзеных грошай вярнулася ў выглядзе льнотрасты, але на 600 мільёнаў рублёў сыравіны не дачакацца, бо лён загінуў. Горш таго, Аршанскі камбінат дабіўся, што Пастаўскі завод, як і астатнія прадпрыемствы вобласці, не змогуць паставіць сёлета ніводнай тоны валакна на іншыя рынкі збыту, дзе гатовы плаціць па 1100 долараў. Вось і не ведаюць завадчане, як будуць далей жыць, за якія сродкі завяршаць пачаты рамонт карпусоў, даху, які стаў месцамі працякаць, дзе знайсці грошы, каб абгарадзіць тэрыторыю. Пры такім адміністрацыйным дыктаце нават у раней багатых льнозаводаў не застанецца сродкаў для падтрымкі гаспадарак, якія сеюць многа лёну.

Але нікога пры сучаснай адміністрацыйна-каманднай сістэме аграпрама гэта не хвалюе. Улады рэкамендуюць, лічы, загадваюць, павялічыць пасевы лёну ў краіне, у тым ліку на Віцебшчыне да 40 тысяч гектараў. Час ідзе, а не выдзелены неабходныя крэдыты для набыцця якаснага насення і гербіцыдаў, не робіцца захадаў, каб гаспадаркі займелі сучасную тэхніку для сяўбы і ўборкі лёну. І каб дасканала прапрацоўвалася ці не галоўнае пытанне справядлівай аплаты за льнопрадукцыю. Пры такіх адносінах да развіцця льнаводства ў рэспубліцы як бы не прыйшлося праз пару гадоў завозіць той жа раней славуты даўгунец з-за межаў краіны.

Уладзімір ШЫК.
Віцебская вобласць.

Зеркало

На "Газпром" оказывают давление по поводу "Роснефти"

"Файнэншл таймс" (Великобритания):

"Крупные российские промышленники и главная деловая газета России утверждают, что нуждающееся в деньгах российское правительство используют политические мускулы и экономические рычаги, пытаясь убедить крупнейшую и богатейшую российскую компанию "Газпром" купить "Роснефть". "Они выкручивают Вяхиреву руки", — заявил один известный бизнесмен (...). Он утверждает, что с Вяхиревым на прошлой неделе встретились некоторые министры и объявили ему, что его работа в контролируемой государством компании может оказаться под угрозой, если он не подаст заявку на участие в конкурсе по "Роснефти".

Как пишет "Коммерсант", "правительство начало прямые переговоры с "Газпромом". (...) Официальные лица в Минтопэнерго и в самом "Газпроме" отказались комментировать это сообщение.

Продажа "Роснефти", прием заявок на участие в конкурсе по которой заканчивается завтра, загнало правительство России в угол, и "Газпром" может быть единственной российской компанией, у которой достаточно глубокие карманы, чтобы выручить его.

Ранее в этом году, когда правительство объявило конкурс по "Роснефти" (...) и назначило стартовую цену в 2,1 млрд. дол., официальные лица надеялись, что это будет самый честный, самый профессиональный и самый доходный конкурс в короткой российской истории подобных мероприятий. Однако снижение мировых цен на нефть ослабило российских корпоративных "бегемотов", которые намеревались участвовать в конкурсе. Возникла опасность, что на самое главное приватизационное событие года вообще не поступит заявок. За последние несколько недель все крупные российские компании, которые ранее выражали заинтересованность в "Роснефти", предупредили: слишком высокая стартовая цена может заставить их отказаться от участия".

Слияние нефтяных групп вряд ли будет завершено

"Файнэншл таймс" (Великобритания):

"Слияние российских нефтяных компаний "ЮКОС" и "Сибнефть", в результате которого намеревались создать крупнейшую в мире нефтяную компанию, заморожено до конца года, а возможно, и вообще не произойдет. Об этом заявил один из представителей, близких к переговорам.

Полагают, что на этой неделе компании публично объявят о своем решении заморозить план слияния. Как полагают, в заявлении будет указано на дружественный характер решения о "разводе" и на то, что компании будут продолжать сотрудничать в области нефтепереработки, используя нефтеперерабатывающие мощности, принадлежащие "ЮКОСУ" (...).

Официально, как полагают, они объявят лишь, что слияние приостановлено до конца года. Однако высшие представители двух компаний, занятые в переговорах, говорят, что вряд ли они будут доведены до конца. (...)

Эти представители также утверждают, что трудности со слиянием начались весной, когда снижение цен на нефть на мировом рынке ослабило финансовое положение обеих компаний и сделало слияние проблематичным. У обеих компаний есть задолженность, деноминированная в долларах, с выплатой которой возникли дополнительные трудности из-за падения цен на нефть. (...) Кроме того, оказалось затруднительным объединить две управленческие команды. После того, как сразу за объявлением о слиянии были проданы офисные помещения в здании, в котором находились компании, несколько недель назад они снова разъехались по разным штаб-квартирам".

Разрушение российской орбитальной станции "Мир" отложено до конца июня

"А-Бэ-Сэ" (Испания):

"Российская орбитальная станция "Мир", ставшая в последние месяцы синонимом проблем и аварий, похоже, закончит свою космическую жизнь не слишком спокойно. Срок уже определен, поскольку, как считают, наступил период выхода станции в резерв или на пенсию (...).

В принципе предусмотрено, что "Мир" исчезнет через полтора года и будет заменен международной космической станцией "Альфа", в создании которой участвуют США, Россия, Западная Европа, Япония и Канада.

Другой вариант предусматривал, что в мае "Мир" начнет постепенно снижаться, чтобы окончательно сойти с орбиты. Однако это произойдет только в конце июня. (...)

Останки российской станции упадут в океан, после того как этот комплекс действовал 12 долгих лет, иногда работая через силу".

"Индия считает себя Сверхиндией"

"Паис" (Испания):

"Облако пыли, поднявшееся в воздух над пустыней, было отлично видно на расстоянии 15 км, где ощущался толчок земли, разбудивший от полуденного сна жителей Похрана и заставил их вспомнить испытания 24-летней давности, когда Индия Индиры Ганди произвела первое подземное атомное испытание в этой же зоне. (...)

После нынешних ядерных испытаний весь мир узнал о существовании Индии, о том, что она существует как и США, Россия, Китай Франция и Великобритания — великие ядерные державы. Индия стала Индией, считающей себя Сверхиндией.

Одна индийская газета охарактеризовала случившееся как "взрыв самоуважения" (...).

Желание индийцев стать постоянным членом Совета Безопасности ООН в будущем расширенном СБ могут стать более реальными после этих взрывов. Однако Индию больше всего интересует проявление неприемлемости того, что она считает режимом ядерного апартеида в мире".

Беларусь

Лукашенко надеется, что представитель ПАСЕ даст объективную оценку политической и экономической ситуации в Беларуси

Президент Александр Лукашенко, который принимал в Минске заместителя председателя Парламентской Ассамблеи Совета Европы (ПАСЕ) Бориса Олейника, отметил:

"Из Киева и Европы не все видится так, как оно есть на самом деле. Думаю, у вас впечатление уже сложилось..."

По словам А.Лукашенко, негативный имидж Беларуси и ее руководству за рубежом создают внутриоппозиционные силы, а также незаинтересованные в нынешнем политическом курсе Минска круги на Западе. "Поэтому очень важно, что такой политик, как вы, прибыл в Беларусь, чтобы на месте разобраться в ситуации", — сказал президент.

Высокопоставленный представитель ПАСЕ также встретился со спикерами обеих палат белорусского парламента Анатолием Малофеевым и Павлом Шипуком.

Российская Федерация

Борис Федоров — снова министр. На этот раз налоговый

Б.Ельцин освободил Александра Починка от должности министра-начальника Госналогслужбы РФ и назначил на этот пост Бориса Федорова.

Из редакционного досье. Б.Федоров родился 13 февраля 1958 года в Москве. В 1980 году окончил Московский финансовый институт. Доктор экономических наук. Работал в Госбанке СССР, Институте мировой экономики и международных отношений АН СССР.

1990—91 гг. Б.Федоров — министр финансов РСФСР в правительстве Ивана Силаева. Ушел в отставку после отказа от реализации программы "500 дней", сторонником и соавтором которой являлся. Затем работал руководителем советских операций ЕБРР. С 23 декабря 1992 г. был назначен вице-премьером в правительстве Виктора Черномырдина, с марта 1993 г. — министр финансов.

12 декабря 1993 года Б.Федоров был избран в Госдуму РФ. До настоящего времени являлся депутатом, председателем подкомиссии по денежно-кредитной политике. Б.Федоров женат, имеет сына и дочь.

Казахстан

Назарбаев и Березовский обсудили вопросы, предлагаемые на рассмотрение предстоящего форума по проблемам СНГ

Президент Нурсултан Назарбаев — один "из самых последовательных сторонников Содружества. Он был и является стержнем СНГ", заявил журналистам исполнительный секретарь СНГ Борис Березовский после встречи с Н.Назарбаевым в Алма-Ате.

По мнению Б.Березовского, часть интеграционных инициатив Н.Назарбаева не реализовывалась именно потому, что "не было технологии реализации этих решений".

На новом этапе СНГ, отметил исполнительный секретарь, "огромная роль" будет отводиться "технологии реализации решений". Если, например, пояснил он, будет принято решение о создании зоны свободной торговли, то будет создана и группа, которая будет "сопровождать выполнение этого решения".

По мнению Б.Березовского, который встречей с Н.Назарбаевым завершил серию переговоров с руководителями государств Содружества, страны СНГ последовательно прошли несколько стадий. Сначала была эйфория от обретения независимости, суверенитета, затем последовало удовлетворение от этой эйфории, потом возникли новые проблемы. В конечном счете стало возникать даже некое разочарование, сказал исполнительный секретарь Содружества. Сегодня, по его словам, появилась уверенность, что "многое можно сделать вместе, если правильно понять, в какой ситуации все находятся".

Б.Березовский отметил важную роль Содружества независимых государств в "цивилизованном разводе" республик бывшего СССР. СНГ, по его словам, "сыграло главную роль" в этом процессе. Это не мало, так как "не произошло тотальной катастрофы, тотального противостояния", отметил исполнительный секретарь.

Стоп-кадр

Остров Крит.

Старонкі гісторыі

Ніна СТУЖЫНСКАЯ, кандыдат гістарычных навук

Гомельскае паўстанне

Паўстанне планавалася на пачатак сакавіка 1919 года ў раёне Лунінца і Пінска. Але акцыя не адбылася, яе арганізатары былі арыштаваны. Аднак салдаты самавольна рушылі з фронту, добраахвотна пакінуўшы Пінск невялічкаму польскаму атраду. Чырвонае камандаванне паспешліва раззброіла мяцежныя палкі і накіравала ў тыл на перафарміраванне. Але і гэтая мера не дапамагла.

Так сталася, што менавіта Гомель стаў цэнтрам адной з самых вядомых падзей агульнарасійскага маштабу часоў грамадзянскай вайны — так званага стрэкапытаўскага мяцежа. Хвалі вайны занеслі ў гэты беларускі горад рэшткі 8-й рэзервовай дывізіі з Бранску і 67-ы і 68-ы палкі Тульскай брыгады, сфарміраваных у асноўным з сялян узгаданых губерній. Камандзіры былі ў асноўным з царскіх афіцэраў, мабілізаваных у Чырвоную Армію. З самага пачатку фарміравання ў Бабруйску і Гомелі гэтыя часткі лічыліся ненадзейнымі. Камандзіры ўсяляк садзейнічалі антысавецкай агітацыі.

Большасць салдат — учарашніх сялян Бранскай і Тульскай губерній — найбольш хвалявала зямельнае пытанне, набліжэнне сяўбы, адсутнасць насення і металічных гаспадарчых прылад. Натуральна, што вясной, напярэдадні сяўбы яны імкнуліся ў родныя вёскі, тым больш што новая ўлада абяцала ім зямлю, хлеб і мір. Вялікае расчараванне ў тых, хто прыйшоў да ўлады, адлюстроўвалася ў прынятых Паўстанцкім камітэтам дакументах. "Большевики обещали нам хлеб, вместо хлеба мы получили нагайку комиссара. Большевики обещали нам мир — вместо мира мы получили гражданскую бойню. Нас обманули, товарищи".

Новая ўлада была аб'яўлена галоўным ворагам. "Наши враги — отбросы всех слоев населения, объединенные жаждой власти, той власти, которая дает им легкую жизнь..." — абвяшчала ўлётка мяцежнікаў.

18 сакавіка 1919 года брыгады былі накіраваны ў раён Корасценя, супраць пятлюраўскіх і польскіх войск, але салдаты адмовіліся ваяваць і патрабавалі вяртання дамоў. Папулярнымі былі лозунгі "Далоў вайну!", "Уладу Пятлюры!", "Мясцовыя супраць Саветаў". 67-ы і 68-ы палкі брыгады самавольна пакінулі фронт і рушылі на Гомель. Па дарозе, у Мазыры, Калінкавічах, Рэчыцы, да іх далучыліся чырвонаармейцы другіх вайсковых адзінак. У распараджэнні паўстанцаў былі два бранянпоезды, гарматы, кулямёты. Ім дапамагалі ўзброеныя чыгуначнікі.

У ноч з 23 на 24 сакавіка 1919 года мяцежнікі захапілі станцыю Гомель-Палескі.

Для кіраўніцтва паўстаннем быў арганізаваны Палескі паўстанцкі камітэт, які ўзначаліў былы афіцэр царскай арміі, эсэр М.А.Стрэкапытаў. Загадам №1 ён абвясціў сябе камандуючым войскамі Гомельскай групы войск. Згодна з першым загадам у часцях павінны былі прайсці выбары ваенных кіраўнікоў. Пад пагрозаю строгай адказнасці забараняліся самавольныя выступленні, грабяжы і пагромы.

Савецкая ўлада была аб'яўлена звергнутай. Адразу Паўстанцкі камітэт звярнуўся да насельніцтва: "Товарищи солдаты! Рабочие и граждане! Мы, солдаты Западного фронта, объявляем правительство Ленина и Троцкого низложенным и постановляем поднять знамя борьбы за права народа... Гоните в шею большевиков, арестовывайте комиссаров, сбрасывайте позорное иго. Ваши враги кажутся вам сильными, потому что вы стоите на коленях. Встаньте с колен! Вся власть в городе Гомеле и окрестностях принадлежит Повстанческому комитету, выбранному солдатами и рабочими. Все распоряжения и приказы, исходящие из него, должны беспрекословно исполняться. Спокойствие в городе не должно быть нарушено. Сохраняйте дисциплину. Мы начинаем великое дело и доведем его до конца.

Да здравствует русская республика! Да здравствует Учредительное собрание.

Вперед к победе!

Повстанческий комитет г. Гомель. 24 марта 1919 г."

Сярод іншых лозунгаў, якія адлюстроўвалі праграму паўстанцкага камітэта, былі спалучэнне ўласнай і дзяржаўнай ініцыятывы ў галіне гандлю і гаспадарчага жыцця, выкананне жорсткіх законаў аб ахове працы і ажыццяўленне грамадзянскіх свабод. Адзін з галоўных лозунгаў — эсэраўскі лозунг "земля — народ".

Арганізатары паўстання стараліся давесці да насельніцтва Гомеля і паветаў, што і суседнія рэгіёны ахапіла хваля мяцяжоў. Улёткі паведамлялі, што паўсталі Арол, Бранск, Рагачоў, Тула, хваляванні вакол Петраграда і Мінска.

Камітэт спадзяваўся на поспех, параўноўваючы падзеі мінулага года з сучаснымі. "Известия о революционном движении в странах согласия (Антанты. — **Н.С.**) — раздуты и подтасованы. Теперь не лето 1918 г. и Гомель — не Ярославль..."

Паўстанцкі камітэт заклікаў сялян далучыцца да мяцежных палкоў.

"Крестьяне! Бейте в набат, гоните советскую сволочь из ваших селений! Выбирайте повстанческие комитеты в селах, деревнях, местечках и вручайте им временную власть!"

Сяляне не засталіся ў баку ад падзей. Хваляванні пракаціліся па Рагачоўскім, Клімавіцкім і іншых паветах Магілёўскай губерні.

У чырвонаармейскіх часцях былі распаўсюджаны ўлёткі са зваротам: "Войскам Ленина и Троцкого. Товарищи! Уже пять лет русский народ льет кровь. Уничтожает молодое поколение. Довольно Вами помыкали. Довольно гнали вас, как стадо на убой. Довольно крови! Долой войну! Да здравствует демобилизация! Но прежде чем разойтись, мы должны свергнуть тех, кто обманом и нагайкой послал вас на смерть, часто раздетых, разутых, голодных... Если вы не свергнете их, то при помощи наемных латышей, татар и китайцев Вас мобилизуют опять и наденут ярмо горше прежнего.

Идите к нам, помогите нам дать России вместо кнута комиссаров свободу, вместо спекуляции — торговлю, вместо комиссародержавия — народоправство..."

З такімі словамі звярнуліся да чырвонаармейцаў "мобилизованные туляки, выгнавшие советскую власть из города Гомеля" (менавіта так яны падпісалі зварот). І трэба сказаць, знайшлі паразуменне.

Так, Віцебскі губком РКП(б) вымушаны быў адазваць чырвонаармейскі атрад, накіраваны ў Гомель для падаўлення паўстання. У выніку агітацыі эсэраў чырвонаармейцы былі гатовы перайсці на бок мяцежнікаў. 100 чырвонаармейцаў карнага эшалона далучыліся да паўстанцаў. Камандаванне чырвонаармейскіх часцей было вымушана адвесці эшалон на станцыю Уза.

Паўстанцкі камітэт звярнуўся і да прафсаюзаў, заклікаючы падтрымаць барацьбу за "право свободного труда, за свободное пользование результатами труда своих рук" і г.д.

Паўстанцкі камітэт паспрабаваў наладзіць жыццё горада. 26 сакавіка Стрэкапытаў выдаў загад "приступить немедленно к организации городского самоуправления по типу существовавшего до октября 1917 года". Горад быў аб'яўлены на асадным становішчы. Усялякі рух забаронены з 21 да 7 гадзін, не дазваляўся продаж гарэлачных вырабаў. Камандзір 1-га эскадрона 2-га кавалерыйскага дывізіёна Сцёпін быў прызначаны камендантам горада Гомеля. Яго першы загад дазваляў свабодны гандаль усім, за выключэннем мануфактуры, метала, гарэлкі. Другі загад абяцаў расстрэл за грабяжы і пагромы, прапанаваў здаць зброю, паведаміць аб месцы знаходжання камісараў. Міліцыя была абавязана прыступіць да выканання сваіх абавязкаў. Служачым дзяржаўных і грамадскіх устаноў прапаноўвалася працягваць выкананне сваіх абавязкаў, акрамя таго выбраць дэлегатаў у Паўстанцкі камітэт.

26 сакавіка савецкая ўлада была звергнута ў Рэчыцы. Паўстанцкі штаб, у склад якога ўвайшлі начальнік гарнізона, начальнік і ад'ютант штаба, давёў да ведама насельніцтва, што ўлада ў горадзе і павеце належыць начальніку паўстаўшага гарнізона, ці, як паведамляла ўлётка, камандзіру Рэчыцкага атрада Народнай арміі Расійскай Рэспублікі — Саладухе. Першая Расійская Рэспубліка была абвешчана пасля далучэння да паўстанцаў Рэчыцкага гарнізона. Сялянам павета паведамілі, што ўлада бальшавікоў скінута, "настало время возрождения, теперь нечего бояться расстрелов чрезвычайки и грабежей под видом законных реквизиций... Ваш долг — земля и плод с нее". У сялян прасілі дапамогі. І яны адгукнуліся хваляй моцных выступленняў.

Загад каменданта Рэчыцы Гурскага папярэджваў аб здачы зброі, забароне руху пасля 23 гадзін. Рабаўнікоў чакаў расстрэл на месцы. Паўстанцы жорстка распраўліся з членамі рэўкома, выканаўчага камітэта, ЧК. Была разбурана гасцініца "Савой", дзе трымалі асаду камуністы, кітайцы-наёмнікі, спартакаўцы. Амаль усе яны былі забіты. Сярод іх былі прадстаўнікі савецкай улады: І.Ланге, Н.Білецкі, С.Камісараў, П.Каганская, Б.Ауэрбах, Л.Файншмідт і іншыя.

Аднак паўстанцы памыліліся з ацэнкай палітычнай сітуацыі і ўласных магчымасцей. Бальшавіцкая дыктатура ўжо набрала моцы і змагла абаперціся на ваенную сілу. Звесткі аб паўстанні ў Гомелі былі абвешчаны на VIII з'ездзе РКП(б), па ўказанні Леніна супраць яго былі накіраваны бронецягнік і часткі бранскага і смаленскага гарнізонаў. Мясцовыя партыйныя камітэты адправілі слухачоў магілёўскіх курсаў чырвоных камандзіраў і мінскай партыйнай школы, а таксама сфарміраваныя камуністычныя атрады з Бабруйска, Клінцоў, Навазыбкава, Прапойска, Віцебска і іншых гарадоў.

Асноўныя сілы для расправы з паўстаўшымі падышлі да Гомеля 28 сакавіка і пачалі блакіраваць і абстрэльваць горад. У Гомелі пачаліся пажары, у тым ліку загарэўся і палац Паскевіча. Мяцежныя часткі распачалі паспешлівую эвакуацыю ў напрамку Рэчыцы, якая суправаджалася панікай, рабаўніцтвам і яўрэйскімі пагромамі. Усяго падчас паўстання загінула каля 100 чалавек.

Цікава, што частка паўстанцаў палічыла за лепшае ў той сітуацыі перайсці на польскі бок. Яны будуць інтэрваваны і змешчаны ў спецыяльныя лагеры. На Беларусь яны вернуцца, у гэтыя ж мясціны разам з генералам С.Булак-Балаховічам. Але гэта ўжо іншая гісторыя.

Польский суд не выдал Александра Пупейко Беларуси

Репортаж из зала варшавского воеводского суда специального корреспондента "Народной воли" в Варшаве

(Окончание. Начало на 1-й стр.)

Затем по процедуре польского экстрадиционного суда Александру Пупейко была предоставлена возможность выразить свое отношение к данным обвинениям. Пупейко заявил, что он не признает обвинения в свой адрес, так как они абсолютно бездоказательны и тенденциозны. Читатели "Народной воли" помнят опубликованное письмо Александра Пупейко, в котором он объяснял подноготную сфабрикованных в отношении его обвинений. Суд также подтвердил, что фактической связи между упоминаемыми в обвинениях кредитами и Александром Пупейко из представленных белорусской прокуратурой материалов установить не представляется возможным. Более того, весьма серьезные сомнения вызывают данные материалы, если соотнести место "совершения преступления" и место пребывания Александра Пупейко в "момент совершения преступления". А адвокат в свою очередь обратил внимание суда на то, что статья УК Беларуси, по которой выдвинуто обвинение против его клиента, вошла в жизнь только в 1997 году, то есть много позже якобы совершенных преступлений. Для Польши, в отличие от нашей стороны, то, что право действует вспять, это юридический нонсенс. Здесь даже "сталинских преступников", то есть тех, кто преследовал и пытал людей в те времена, можно осудить только, если они нарушили "сталинское право", а в отношении генерала Ярузельского и тогдашнего руководства страны, которое ввело в 1981 году в Польше военное положение, исследуется, как они нарушили право, действующее в те времена, а не действующее в нынешней демократической Польше.

По окончании первого часа судебного заседания в воздухе запахло скандалом. Польский суд явно не имел никакого желания благосклонно смотреть на то "сено" (по выражению одного из польских юристов), которое представила белорусская прокуратура. Надо сказать, что судьи в Польше не церемонятся и с собственной прокуратурой, отклоняя ее иски и заявления, если те составлены неправильно или неумело. Правовая грамотность прокуроров, тем более белорусских, — это проблема их самих, но уж никак не суда.

